# Працаваць дыстанцыйна — не значыць быць на сувязі круглыя суткі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ** растлумачыў, па якіх прычынах работнік можа звольніцца да завяршэння тэрміну дзеяння тэрміновага дагавора, кантракта.

«Калі заключаецца тэрміновы працоўны дагавор і бакі першапачаткова агаворваюць альбо тэрмін дзеяння дакумента, альбо работу, якую супрацоўнік павінен выканаць (гэта таксама будзе тэрміновы дагавор), для скасавання дагавора ў гэтым перыядзе неабходная абгрунтаваная прычына», — расказаў Ігар Старавойтаў.

У такім выпадку дзейнічае цалкам люстраны падыход: ні адзін з бакоў не можа неабгрунтавана звольніць або звольніцца. У наймальніка, які заключыў кантракт альбо тэрміновы працоўны дагавор, рычагом з'яўляецца істотнае змяненне ўмоў працы. Калі гэта адбываецца, у работніка ёсць права: ён альбо згаджаецца працаваць у іншых умовах, альбо звальняецца. Пры гэтым у наймальніка павінна быць аб'ектыўная прычына для змены істотных умоў, ён не можа проста прыдумаць яе.

Тое ж самае для работніка: артыкул 41 Працоўнага кодэкса кажа пра тое, што можна спыніць адносіны пры тэрміновым працоўным дагаворы, у тым ліку па кантракце, калі ў работніка ёсць на гэта аб'ектыўныя прычыны. Сярод такіх прычын у тым ліку надыход пенсійнага ўзросту для работніка, яго хвароба і іншае. Такім чынам, у работніка ёсць магчымасць звольніцца не толькі па пагадненні бакоў, але і па сваёй ініцыятыве.

## Прафсаюзы заклікаюць звяртацца да іх, калі работадавец парушае закон

Дарэчы, прафсаюзы нярэдка сутыкаюцца з невыкананнем прынцыпу люстраных адносін. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення юрыдычнай работы і прававога забеспячэння апарата Савета ФПБ Марыны ЛАЗАР**, да іх масава паступалі звароты грамадзян. У прыватнасці, яны датычыліся 41-га артыкула, калі наймальнік не хацеў звальняць работніка, у якога былі абгрунтаваныя прычыны, ці парушаліся нормы заканадаўства альбо кантракта з работнікам.

«Мы ў рамках сваіх паўнамоцтваў ажыццяўляем грамадскі кантроль, выдаём рэкамендацыі, і наймальнікі, як правіла, гэта выконваюць. Калі не, тады прававая інспекцыя ідзе з гэтым работнікам у суд і там прадстаўляе яго інтарэсы», — адзначае Марына Лазар. Таксама ў калектыўным дагаворы можна дадаткова прапісаць прычыны, якія стануць падставай для спынення кантракта па ініцыятыве работніка.

## Што такое дыстанцыйная работа і чым яна адрозніваецца ад надомнай?

Працоўны кодэкс дапоўнены асобным раздзелам 251, які датычыцца асаблівасцяў рэгулявання працы работнікаў, якія працуюць дыстанцыйна.

Як тлумачыць на сваім сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, дыстанцыйнай работай будзе лічыцца тая, якую работнік выконвае па-за месцам знаходжання наймальніка з выкарыстаннем для выканання гэтай работы і ажыццяўлення ўзаемадзеяння з наймальнікам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

На работнікаў, якія ажыццяўляюць дыстанцыйную работу, будуць распаўсюджвацца агульныя нормы Працоўнага кодэкса, у тым ліку ў частцы працягласці рабочага часу і часу адпачынку, водпускаў і г. д. Такім чынам, асобам, якія працуюць на дыстанцыі і якія заключылі працоўны дагавор, будуць давацца ўсе сацыяльна-працоўныя гарантыі, прадугледжаныя працоўным заканадаўствам. Нягледзячы на тое, што ў штатным раскладзе павінна адлюстроўвацца наяўнасць такога работніка, асаблівасцю гэтых працоўных адносін стане тое, што наймальніку не трэба будзе абсталёўваць рабочае месца непасрэдна ў офісе або іншым памяшканні. У сувязі з гэтым у працоўным дагаворы абавязкова павінна быць пазначана, што работа з'яўляецца дыстанцыйнай.

У адрозненне ад работнікаў-надомнікаў, якія выконваюць работу па месцы свайго жыхарства або ў іншых памяшканнях па іх выбары па-за памяшканнямі наймальніка, работнік, які ажыццяўляе дыстанцыйную работу, зможа выконваць яе з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у любым месцы, дзе будзе зручна яму самому.

## Дыстанцыйная работа будзе пачынацца з асабістай сустрэчы

Новым законам прадугледжваецца, што заключэнне працоўнага дагавора з работнікам, які будзе выконваць дыстанцыйную работу, павінна ажыццяўляцца толькі пры асабістай прысутнасці работніка.

У Расіі, па словах Ігара Старавойтава, таксама ёсць нормы рэгулявання дыстанцыйнай работы. З аднаго боку, яны падобныя на тыя, што прыняты ў Беларусі, але ёсць нюансы. Напрыклад, няма патрабавання асабістай сустрэчы наймальніка і работніка пры падпісанні працоўнага дагавора. У Расіі, калі кажуць аб дыстанцыйнай рабоце, больш думаюць пра адлегласці. Бо, напрыклад, паміж Масквой і Уладзівастокам велізарная адлегласць. «Мы ж, калі гаворым аб дыстанцыйнай рабоце, вядзём гаворку пра тое, што спрабуем рэгуляваць новую мабільную форму працы. Работнік можа знаходзіцца ад наймальніка зусім недалёка, пры гэтым ён працуе ў пэўнай форме адносін, у мабільным рэжыме, калі ў яго няма пэўнага рабочага месца. Гэта галоўная ідэалогія, якая была закладзена ў нашай частцы «Дыстанцыйная работа». Галоўнае, што чалавек атрымлівае права ў мабільным рэжыме, не прывязваючыся да нейкага месца, выконваць работу і быць супрацоўнікам арганізацыі», — адзначыў намеснік міністра.

Пры гэтым норма аб неабходнасці наймальніку і будучаму работніку сустрэцца пры падпісанні працоўнага дагавора падвяргалася крытыцы. Але, як адзначыў на круглым стале **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Віталь ШЫЛАЎ**, наймальнік павінен убачыць таго работніка, за якога ён будзе плаціць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, якому будзе забяспечваць сацыяльнае страхаванне, аплачваць адпачынак. Пасля гэтага яны могуць не сустракацца. «Магчыма, у будучыні мы прыйдзем і да электроннай працоўнай кніжкі, будзем заключаць смарт-кантракты», — дадаў дэпутат.


staff-online.ru

## Мінпрацы і прафсаюзы будуць абараняць дыстанцыйных работнікаў

— Ёсць адна сур'ёзная праблема, — заўважыў Ігар Старавойтаў. — Паколькі такі работнік не прывязаны да офіса, ён не абаронены ад таго, што наймальнік можа звязвацца з ім практычна кругласутачна. У адрозненне ад работніка, які прыйшоў з работы дадому і можа заняцца сваімі справамі, дыстанцыйны работнік знаходзіцца пастаянна ў кантакце, таму часцяком у такіх людзей узнікаюць пэўныя стрэсавыя сітуацыі і захворванні. Мы з дапамогай прафсаюзаў будзем сачыць за гэтай праблемай, маніторыць, наколькі яна для нас стане актуальнай.

Калі такія праблемы будуць узнікаць, то, паводле слоў намесніка міністра, трэба будзе падумаць над устаноўкай нейкіх патрабаванняў. Напрыклад, каб наймальнік у пэўны час сутак не выходзіў на сувязь, не адпраўляў пошту, каб работнік быў вольны ад сваіх абавязкаў.

## Якія яшчэ навацыі чакаюць нас?

Нагадаем, што новы закон рэгулюе парадак часовага пераводу са згоды работніка на іншую работу, у тым ліку да іншага наймальніка. Ён замацоўвае дадатковыя сацыяльна-працоўныя гарантыі, у тым ліку дае бацьку па яго жаданні адпачынак (да 14 каляндарных дзён) пры нараджэнні ў сям'і дзіцяці; здымае забарону на накіраванне ў службовую камандзіроўку жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Сярод іншых навацый — магчымасць працаваць па сумяшчальніцтве поўны рабочы дзень або змену ў перыяд працоўнага водпуску. Памер выхаднай дапамогі павялічаны да адной сярэднямесячнай заработнай платы, калі звальненне работніка адбылося з прычыны ўстанаўлення няпоўнага рабочага часу (менш за палову нормы). Таксама замацаваны нормы, якія прадугледжваюць, што матэрыяльная адказнасць супрацоўнікаў, якія працуюць па кантракце, надыходзіць у тых жа выпадках і пры тых жа ўмовах, што і ў работнікаў, з якімі заключаны працоўныя дагаворы, г. зн. толькі за наўмыснае прычыненне маёмаснай шкоды.

**Святлана БУСЬКО.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## У КРАІНЕ СТВАРАЕЦЦА АВІЯЦЫЙНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ

**У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 04.09.2019 № 328 «Аб стварэнні ўстановы» арганізуецца дзяржаўная ўстанова «Авіяцыйная інспекцыя» з мэтай рэалізацыі міжнародных абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь у галіне бяспекі палётаў і авіяцыйнай бяспекі, прынятых у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.**

Авіяцыйная інспекцыя будзе падпарадкоўвацца непасрэдна Дэпартаменту па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый, з'яўляцца яго інспекцыйным органам і ажыццяўляць шэраг функцый спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі ў рамках міжнародных абавязацельстваў дзяржавы па выкананні патрабаванняў ІКАО.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

**Восьмага верасня споўнілася 78 гадоў са дня, калі самкнулася кола варожай блакады вакол Ленінграда. 900 дзён і начэй правялі гараджане ў акружэнні, за гэты час з трох мільёнаў чалавек у жывых засталася толькі трэць.**

Грамадскія аб'яднанні «Беларускі Саюз блакаднікаў Ленінграда» і «Непаўналетнія ахвяры блакаднага Ленінграда» пры падтрымцы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правялі ў гэты дзень гарадскую акцыю памяці і смутку «Нічто не забыты, нішто не забыта». У праграме — ускладанне кветак да Стэлы «Мінск — горад-герой» і канцэрт-рэквіем, які пройдзе ў канферэнц-зале Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## НА ЛЯЧЭННЕ ЗБІРАЛІ СЯМ'ЁЙ

**Усё скрала жанчына, якая даглядала цяжкахворую.**

Праваахоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі 35-гадовую жыхарку Нясвіжскага раёна.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, 52-гадовага мужчыну напаткала сумная доля — яго жонка цяжка захварэла. Каб дапамагчы ёй, муж і сваякі вырашылі сабраць грашовыя сродкі на лячэнне ў сталіцы. Блізкія дапамагалі чым маглі: хтосьці грашыма, нехта дарагімі ювелірнымі вырабамі. Агульная сума сабраных сродкаў склала каля 24 тысяч рублёў. З імі муж з жонкай адправіліся на лячэнне ў сталіцу. Аднак грошы не спатрэбіліся — жанчыну выратаваць не ўдалося.

Даведаўшыся пра тое, што здарылася, мужчына добра выпіў, пасля чаго апынуўся на чыгуначным вакзале. Там яму выразшылі дапамагчы неабыякавыя грамадзяне: маладыя людзі датэлефанаваліся да знаёмай, якая раней даглядала памерлую жонку. Жанчына адказала, што пад'едзе і дапаможа дабрацца да гасцініцы. Яна сапраўды зрабіла гэта, аднак пасля таго, як мужчына заснуў у нумары, скрала з яго сумкі каштоўнасці і грошы.

Прачнуўшыся раніцай і не знайшоўшы ювелірных вырабаў, мужчына падумаў, што яго абрабавалі на вакзале. Па вяртанні ў Віцебск пацярпелы расказаў сваякам пра тое, што адбылося. Сям'я адразу ж звярнулася да праваахоўнікаў.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі 35-гадовую зламысніцу па месцы жыхарства. Частку выкрадзенай маёмасці жанчына паспела здаць у ламбард, а грошы выдаткаваць на асабістыя патрэбы.

## ЗАСЫПАЛА ТРАІХ, ДВОЕ З ІХ ЗАГІНУЛІ

**У Маладзечне праводзяць праверку гібелі двух мужчын пры абрушэнні грунту ў траншэі, паведамілі ў Следчым камітэце. Няшчасны выпадак адбыўся на тэрыторыі гаражнага кааператыва.**

Трое мужчын праводзілі земляныя работы па ўладкаванні ліўневай каналізацыі з уласнай ініцыятывы. У нейкі момант адбылося абвальванне грунту ў траншэі, глыбіня якой складала больш за два метры, шырыня — паўтара. У выніку тры чалавекі былі засыпаны. Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі на месца, дасталі мужчын. Пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў медыкі канстатавалі смерць дваіх — 20-гадовага і 37-гадовага, трэці, 43-гадовы, быў шпіталізаваны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**